№ 5 (34) Чэцьверг 17-га лютага, 1927 г. м. Вільня Год II.

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць раз у тыдзень Цана нумару 20 грош.

Нацыяна[illegible]драджэнь[illegible]—Тэрытарыяльная і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмо[illegible]—[illegible]раці[illegible] [illegible]ацыянальная царква.—Краевая згода.—Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісная цан[illegible] на 1 [illegible]
„ „ „ 3 [illegible]
Заграніцу ўдв[illegible]

[illegible]дрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul.Ludwisarska 5 m 2.
[illegible]эдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: перад тэкстам—20 гр.
„ сярод тэксту —25 гр.
„ на апош. стар.—10 гр.
за радок нонпарэля.

ПЕРАЛОМ.

Зьнішчаная і абязкроўленая войнамі, змучаная панаваньнем і экспэрымэнтамі полёнізацыйнымі, асадніцкімі і адміністрацыйнымі папярэдніх шовіністычных урадаў, баламучаная рознымі партыямі і арганізацыямі; адрэзаная жалезным кардонам ад сваей другой жывой паловы — ляжала нашая матка—Заходняя Беларусь разьбітая, агалелая, у цемры, у голадзе, у той час як іншыя больш шчасьлівыя народы даўно залечыўшы свае раны пасьля сусьветнай вайны, будаваліся, крэплі, кавалі сваё новае лепшае жыцьцё. Стагнала і чакала лепшых дзён. І вось прыйшоў радасны май. Колькі надзеяў, колькі думак! Усе чакалі ад новага Ураду новага жыцьця. Чакалі і Беларусы. Але рэформы ня йшлі. На мейсца іх прыйшла да Беларускага Народу высланіца Чырвонага Суседа—Грамада і павяла Беларускі Народ па блуднай дарозе у славу 3-га Інтэрнацыяналу.

А там прыйшлі рэпрэсіі, а за імі і арышты. Зноў стагнала ад гора і сьлёз нашая Маці... Але часта сярод гора сталі ўжо чутны ноткі гневу народнага...

Нядаўна быўшы ў Вільні новы міністар Асьветы адкрыта заявіў, што справядлівыя жаданьні беларусамі роднай школы павінны быць споўнены. У Вільні адкрываюцца пасяджаньні камісіі лінгвістаў з удзелам выдатных беларускіх культурных дзеячоў у справе беларускіх школаў. Камісія апрацоўвае плян навучаньня ў беларускіх школах, абгаварывае справу друку падручнікаў і г. д. У Варшаве ў камітэце экспэртаў у справах меншасьцяў, складзеным з выдатных дэмакратаў п.п. Голувкі, Васілеўскага і Лёвэнгэрца справа беларуская займае першае мейсца. На парадак дзенны пастаўлена яна і ў Урадзе.

Дык гэтыя *першыя* праявы шчырага і справядлівага трактаваньня патрэбаў беларускага народу Урадам Маршалка Пілсудскага мы спатыкаем з здаваленьнем.

Праўда разам з першымі гэтымі пачынаньнямі Ураду на карысьць беларусаў, пачалася зьвяга на беларусаў з боку шовіністычнай прэсы. Апіраючыся на антыдзяржаўнай і бальшавіцкай рабоце Грамады, шовіністычныя партыі прабуюць кампрамітацыю Грамады — партыі прыраўняць да кампрамітацыі ў бальшавізьме ўсяго Беларускага Народу. Аднак жа мы думаем, што цяпер для кожнага знаючага крэсы — ёсьць ясным як дзень, што Грамаду стварылі выключна варункі жыцьця і адносіны да беларусаў з боку Дзяржавы. Калі гэтыя варункі зьменяцца, калі Дзяржава і да беларусаў будзе адносіцца гэтак жа, як да сваіх іншых паўнапраўных грамадзян, дык розныя Грамады разьляцяцца як імгла. Развал Грамады, які распачаўся пад ударамі антыграмадаўскай і лёяльнай да Дзяржавы Беларускай Нацыянальнай Рады, сьведчыць аб *нятрываласьці ідэолёгічных* падставаў Грамады. Грамада вырасла выключна на нездаровым грунце нянавісьці, крыўды і помсты—на грунце нэгатыўным. Пазытыўнага хаця-бы комуністычнага грунту ў ёй ніколі ня было, апрача купленых за грошы невялікай кучкі наймітаў—комуністаў і нацыянал-рэнэгатаў. А аб тым, што будзе з Грамадою, калі рэформы пачнуць праводзіцца у жыцьцё і як іх спаткае Беларускі народ, красамоўна кажуць пастановы акружнай Навагрудзкай канфэрэнцыі лёкальных арганізацыяў Беларускай Нацыянальнай Рады ў Баранавічах 8-га г. лютага.

Акружная Навагрудзкая Канфэрэнцыя Беларускай Нацыянальнай Рады.

8-га лютага ў Баранавічах адбылася акружная канфэрэнцыя паўнамоцных прадстаўнікоў паасобных групаў Беларускай Нац. Рады з усіх паветаў Навагрудзкага Ваяводзтва. Прысутных была 19 дэлегатаў; канфэрэнцыя была ўнутранаарганізацыйная, закрытая. Старшынёю быў выбраны Я. Ярош, сэкрэтаром Х. Шыбут.

Інфармацыйны даклад па агульна палітычнаму пытаньню зрабіў Старшыня Бел. Нац. Рады А. Паўлюкевіч. Даклад аб працы „Прасьветы" зрабіў рэдактар „Бел. Слова" п. Тодар Вернікоўскі. Пасьля гэтага ўсе дэлегаты адчыталі свае рэфараты аб дзейнасьці сваіх групаў, аб патрэбах насяленьня, зрабілі свае ўвагі і прапазыцыі. З дакладаў было відаць аб вялікім пасьпеху нацыянальнай працы на мейсцох, якую вядуць прадстаўнікі Бел. Нац. Рады. Асабліва цікавы даклад зрабіў прадстаўнік павету Навагрудзкага п. Гарбун, які далажыў аб арганізаваньні 12 гурткоў „Прасьветы" з лікам вышэй 200 сябраў, развалу пад ударамі яго групы 23 гурткоў Грамады—13 ў Навагрудзкім павеце і 10 у Слонімскім і аб усё больш нарастаючай сіле і крэпасьці лёкальных арганізацыяў Бел. Нац. Рады і каранной зьмене настрояў насяленьня да Грамады. Ня менш цікавы даклад зрабіў п. Маеўскі, прадстаўнік Лідчыны, які зарганізаваў сільны гурток „Прасьветы" ў складзе некалькіх дзесяткаў сябраў у Лідзе; зарганізаваў пры ім чытальню—бібліятэку, шырока пусьціў па ваколічным вёскам нашую газэту. Апрача таго п. Маеўскі прадставіў многа цікавых і цэнных праэктаў, між іншым аб патрэбе арганізаваньня „Беларускага Праваслаўнага Брацтва", які прыняты канфэрэнцыяй.

Пасьля рэфэратаў была адчынена дыскусія, у рэзультаце якой была прынята друкаваная вышэй рэзалюцыя. Прыемна была адзначыць надзвычай сэрдэчны настрой, які панаваў на канфэрэнцыі. Ня глядзячы на заявы некаторых сябраў аб пагрозах з боку Грамады тэррорам, усе бяз вынятку дэкляравалі свае сілы для змаганьня за беларускую нацыянальную ідэю. Пасьля канфэрэнцыі адбылася скромная агульная вячэра.

Рэзалюцыя

Навагрудзкай Акружнай Канфэрэнцыі Беларускай Нацыянальнай Рады ў Баранавічах.

Канфэрэнцыя адбылася 8 лютага 1927 г. у складзе 19 паўнамоцных прадстаўнікоў мясцовых арганізацый Беларускай Нацыянальнай Рады са усіх паветаў Навагрудзкага ваяводзтва.

Зьезд вынес гэткую рэзалюцыю:

Стоячы на грунце пастановаў Зьезду Заходняй Беларусі, які адбыўся 27—8 чэрвеня 1926 г. з задаваленьнем констатуючы пачатак новага курсу палітыкі ўраду марш. Пілсудскага ў адносінах да беларусаў, канфэрэнцыя пастанаўляе:

1) Злучыць усе здаровыя нацыянальна-дэмакратычныя сілы Навагрудчыны пад нацыянальным штандарам Беларускай Нацыянальнай Рады і злучыць у адналітую стройную арганізацыю.

2) На падставе выясьненьня п. міністра Рэлігійных Вераваньняў і Публічнае Асьветы прэсе—прасіць:

а) зараз жа адчыніць беларускія настаўніцкія курсы ў Вільні;

б) матэрыяльна падтрымаць беларускія гімназіі і даць ім правы;

в) загадзя прыняць адпаведныя крокі для утварэньня з пачаткам наступнага школьнага году хаця-бы аднэй беларускай вучыцельскай сэмінарыі;

г) даць правы беларускім абітур'ентам;

д) прыняць адпаведныя крокі да выдрукаваньня патрэбных падручнікаў для беларускіх урадовых школаў на наступаючы школьны год.

3) прасіць урад аб запамогу зярном і грашыма насяленьню, пацярпеўшых ад неўраджаю мясцовасьцяў.

4) Прасіць Пана Міністра Асьветы прадоўжыць час складаньня дэклярацыяў на беларускія школы.

5) Пашырыць на беларускіх вёсках і мястэчках культурна-прасьветную працу, шляхам утварэньня гурткоў „Прасьветы", адчыненьня бібліятэк, арганізацыі аматарскіх групаў і г.д.

6) Выразіць задаваленьне і падзяку Т-ву „Беларуская Хатка" ў Вільні, за асыгнаваньне грошаў на культурна прасьветную беларускую працу.

7) Констатуючы факт, што Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада зьяўляецца арганізацыяй пралетарска-комуністычнай, а не нацыянальна-беларускай, што дэмаралізуе яна сялянскія масы, а сваімі інтэрнацыянальнымі настроямі падрывае ўвесь беларускі адраджэнчы рух і наражае беларускае сялянства сваёй рэвалюцыйнай тактыкай на няшчасьці і беды — вясьці рашучую барацьбу з г. зв. „гурткамі" Грамады на мяйсцох, тлумачачы абаламучаным сялянам усю шкадлівасьць так для беларускага нацыянальнага руху як і для беларускага насяленьня работы Грамады.

8) Вясьці рашучую барацьбу з уплывамі саюзьніцы Грамады г зв. Незалежнай Хлопскай Партыі, на чале якой стаіць нядаўна выкрыты правакатар пасол Ваяводзкі, каторы разам са сваей саюзьніцай Грамадой пхае на рэвалюцыйную працу беларускіх сялян, даносячы адначасна аб іх уладзе.

9) Констатуючы поўную няжыццёвасьць сучасных крэсавых самаўрадаў, трэбаваць новых выбараў да гмінных радаў і павятовых сэймікаў, а таксама дапушчэньня на пасады ў самаўрадзе і адміністрацыі беларусаў.

10) Пратэставаць проціў нішчэньня лясоў.

11) Русыфікацыйную працу сярод масы беларускага народу, якую распачала новапаўстаўшая расейская арганізацыя г. зв. Расейскае Народнае Аб'еднаньне, фактычным кіраўніком каторага зьяўляецца „зьменавехавец" пасол Серэбранікаў—лічыць бязумоўна шкадлівай, як прэтэндуючай на кіраўніцтва чужым для яе беларускім народам, які яна прызнае толькі, як этнаграфічную разнавіднасьць расейцаў, не прызнаючы ані беларускай культуры, ані школы, што відаць з пратаколу зьезду гэтай арганізацыі ў Львове 2 лютага г.г.

12) Стоячы на грунце краёвае згоды, імкнуцца да супрацоўніцтва і каапэрацыі з польскім крэсовым грамадзянствам.

13) Выдзяліць са складу канфэрэнцыі дэлегацыю, якой разам з дэлегацыямі іншых акругоў даручыць перадаць вышэйпаданыя жаданьні з абшырнымі выясьненьнямі на рукі Ураду.

Палітычны агляд.

У Парыжы дасягнута згода між хаўрусьнікамі і Нямеччынай адносна нямецкіх фортыфікацыяў на Усходзе і вываза ваеннага матэрыялу з Нямеччыны, але коштам Польшчы, бо вынікі гэтае згоды лічацца зусім некарыснымі для Польшчы. Каб толькі захаваць Лёкарно і стрымаць свае абяцанкі, даныя ў Жэнэве, Брыян пайшоў на вельмі вялікія ўступкі, каб толькі дайсьці да кампрамісу з немцамі. З 88 новых бэтона жалезных фартоў, выбудаваных пасьля 1920 г на польскай граніцы, немцы маюць права пакінуць у цэласьці 54, а ласьне: у Кэнігсбэрге—31, Глогаве на р. Одры — 8 і ў Летцэне на Мазурскіх вазёрах — 15. Рэшту мусяць зьнішчыць у працягу 4 месяцаў, пачынаючы з 25 лютага гэтага г., а ласьне: 7 фартоў па правым беразе Одры перад Глогавам, 5 перад Кюстрынам і 22 у палуднёвай часьці Кэнігсбэрга, скіраваных проці Польшчы.


Гэткім чынам немцы ня толькі ня былі пакараны за нарушэньне 180 параграфу Вэрсальскага трактату, але нават выйшлі з гэтай афэры вельмі добра. У выніку 8 гадовага кантролю хаўрусьнікаў яны аказаліся зусім падгатоўленымі для зачэпнай вайны на сваей ўсходняй граніцы з Польшчай, чаго большасьць нямецкай прэсы ня лічыць патрэбным таіць. Немцы забавязаліся на слова, што збураць гэтыя 34 фарты і ня будуць будаваць новых у накрэсьлянай паласе. Але-ж ці можна верыць нямецкім абяцанкам і чаму цяперашні нацыяналістычны Урад, стоячый выразна на грунце рэванша і рэстаўрацыйй манархіі будзе старацца быць больш лёяльным адносна хаўрусьнікаў, чым папярэднія рэспубліканскія ўрады, пры якіх з захаваньнем поўнай тайны былі выбудаваны аж 84 бэтонныя фарты.

Але на гэтым яшчэ не канец польскім клапотам са сваім заходнім суседам. У той, пакуль што бязкроўнай барацьбе, якая вядзецца з немцамі на ўсходняй граніцы, Польшча засталася ў адзінстве. Францыя, як відаць з яе палітыкі, зусім ня выказвае замеру псаваць наладзіўшыяся адносіны са сваім усходнім суседам. Гэта-ж самая можна сказаць і пра італьянцаў, якія нават канкуруюць у дасягненьні нямецкай дружбы з французамі. Што жа датычыць англічан, дык яны пакуль што маюць даволі сваіх клопатаў у Азіі і ім не да Нямеччыны. Але апрача ўсяго гэтага застаецца занатаваць яшчэ адзін вельмі некарысны для Польшчы факт — гэта зьмяніўшуюся пазыцыю Малай Антанты адносна немцаў. Дзякуючы Лёкарно і француска-нямецкай згодзе ўплыў Францыі на Малую Антанту зусім аслабеў, і Малая Антанта павалі траціць сваё назначэньне — усходняга фарпоста Францыі проці Нямеччыны. Да гэтага далучыліся яшчэ мясцовыя абставіны У Чэха Славакіі дайшло да згоды з немцамі, якія ўвайшлі нават да Ураду. Дзеля гэтага ня можа быць нават і гутаркі аб тым, каб Чэха-Славакія выступіла проці Нямеччыны, з якой пасьля Лёкарно адносіны значна палепшалі. Румынія заключыла з Італіяй трактат прыязьні і гэтак сама ня мае замеру выступаць проці немцаў, як новага хаўрусьніка свайго хаўрусьніка. Застаецца адна Юга Славія, якой рукі зьвязаны экспансыяй Італіі на Балканах і яе зближэньнем з немцамі, Вэнгрыяй, Баўгарыяй і Албаніяй. Дзякуючы гэтакай палітычнай канюнктуры ў Сярэдняй Эўропе цяпер нават не заметна трывогі па поваду стварэньня нацыяналістычнага ўраду ў Бэрліне і небясьпекі прылучэньня Аўстрыі да Нямеччыны. Гэтая надзвычай карысная для немцаў сытуацыя зрабіла ўплыў на польска-нямецкія гандлёвыя перагаворы, якія ўжо каля двух гадоў вядуцца і ня могуць рушыцца з места. Нямецкая дэлегацыя, прычапіўшыся да дробнага факту высяленьня польскім ўрадам 4 нямецкіх грамадзян з В. Слёнзку, заявіла, што яна ня можа распачаць перагавораў і віну за гэта складае на польскі ўрад. Гэтага і трэба было чакаць пасля мовы лідэра нямецкіх нацыяналістаў, гуляючых кіруючую ролю ў новым нямецкім урадзе, што ня можа быць мовы, аб польска нямецкім гандлёвым дагаворы пакуль польскі ўрад ня выпаўніць палітычных варункаў, на якія апошні не згаджаюцца. Гэткім чынам адна Польшча выступіла проці нямецкай экспансыі на Ўсходзе маючы ў сябе за сьпіною ня меншага ворага ў асобе Радавай Расеі, робячай гэтакі-ж напор проці Польшчы са Ўсхода.

На Далёкім Усходзе, на які зьвернута ўвага ўсяго сьвета, наступіў пералом к лепшаму. Вялікія дзяржавы ўсхапіліся нарэшце, што робяць вельмі вялікую абмылку, выступаючы ў Кітае кожная паасобку. Узаемныя інтрыгі, на якіх вельмі лоўка ўмеюць іграць бальшавікі, толькі ўзмацнілі кітайскі антычужаземны рух. Яшчэ што поўгода — год таму назад можна было зрабіць пасрэдствам аднэй дыплёматычнай інтэрвэнцыі, тое цяпер невядома ці будзе магчыма дасягнуць пасрэдствам аружнай акцыі Але ў кожным выпадку вялікія дзяржавы, яшчэ нядаўна ўмыўшыя па пілатаўскі рукі ў кітайскіх труднасьцях Англіі, і даўшыя нэгатыўны адказ на яе мэмарандум аб дапамозе, рашылі выступіць супольна проці чырвонага Кантона, адкрыта падтрымліванага бальшавікамі.

Перш-на-перш згадзілася падтрымаць англічан у Кітае Італія ў выніку падарожы ангельскага міністра скарбу Чэрчыля да Рыму. За гэта Італіі абецана грашовая пазыка на ангельскім рынку і можа яшчэ якія небудзь канцэсіі на Балканах і Бл. Усходзе. Італія ўжо выслала свой ваенны флёт і сухапутныя атрады да Шанхая. Гэ-

Да фашыстаускага перавароту у Літве.





Перад новым годам у Літве адбыўся дзяржаўны пераварот. Новы ўрад пачаў энэргічна змагацца з комунізмам. На фатаграфіі мы бачым галаву новага ўраду прафэсара Вальдэмараса і маёра Плешавічуса, які зрабіў пераварот.

так сама і Амэрыка заявіла, што не дапусьціць да захапленьня Шанхая кантонскімі вайскамі і скасаваньня чужаземных канцэсіяў на тэрыторыі Кітая. Больш прыхільна да агульнай акцыйі аднясласе і Японія, выслаўшая на ўсялякі выпадак дужа моцную ваенную эскадру ў кітайскія воды. Гэткім чынам Кантон ў выпадку наступленьня на Шанхай можа выклікаць аружную інтэрвэнцыю ўсіх вялікіх дзяржаваў, пастанавіўшых нарэшце выступіць у абарону як свайго гонара, гэтак сама і матэрыяльных карысьцяў. Кантон, здаецца, ужо пачуў, што перацягнуў струну і прапусьціў добры мамэнт для перагавораў з англічанамі, якія яшчэ нядаўна ішлі на вельмі вялікія ўступкі, а цяпер пад уплывам палепшаньня сытуацыі сталі больш упартымі. Кантонскі міністар замежных справаў Чанг афіцыяльна ўжо заявіў, што кантонскі ўрад ня мае замеру займаць шанхайскіх чужаземных канцэсіяў, а кантонскі ўрад зьвярнуўся да ўсіх работніцкіх і грамадзкіх арганізацыяў, каб спынілі напасьці на грамадзян чужых дзяржаваў і ў прыватнасьці проці англічан дзеля таго, што кітайскі народ вядзе барацьбу з англійскім імпэрыялізмам, а не з англійскімі грамадзянамі. Нават самі інспіратары кантонскага паўстанчаскага руху большавікі збавілі тону адносна англічан і ўзмацнілі акцыю ў прэсе проці Польшчы.

Застаецца яшчэ ў некалькіх словах закрануць чарговую рэвалюцыю ў Партугаліі, якая выцякае з істоты дыктатарскага рэжыму, і якая на гэты раз была вельмі крывавая і таксама чарговую рэвалюцыю ў Палуднёва-амэрыканскай рэспубліцы Чылі. Наагул трэба занатаваць, што бальшавізм запускае глыбокія корні ў Палуднёва-амэрыканскіх рэспубліках, як Чылі, Бразылія, Аргэнтына, Пэру і інш., дзякуючы таму, што апошнія перажываюць вельмі цяжкі эканамічны крызіс і маюць шмат безработнай эміграцыі.

N.

ПАДАРОЖА ПРЭЗЫДЭНТА ПОЛЬШЧЫ ДА ЧЭХАСЛАВАКІІ. Пражскія газэты падаюць, што прэзыдэнт Польшчы Масьціцкі мае замер у красавіку зрабіць візыт чэхаславацкаму прэзыдэнту Масарыку.

УКРАІНСКАЯ ВАЙСКОВАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ. У Львове выкрыта вялікая украінская вайсковая і тэрорыстычная арганізацыя. Устаноўлена, што арганізацыя займалася і шпіёнствам. Арыштавана дагэтуль 11 асоб.

У арыштаваных знойдзены рэвальвэры і ручныя гранаты. Польскія газэты зьвязываюць гэтую арганізацыю з забойствам Львоўскага школьнага куратара Собінскага.

НАРАДЫ Ў СПРАВЕ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЬЦЯЎ. На прошлым тыдні распачалася ў Варшаве трохдзённая сэсія камітэту экспэртаў для справаў нацыянальных меншасьцяў. У склад гэтага камітэту уваходзяць: Лявон Васілеўскі, Лёвэнгэрц і Тадэуш Голувко. У мінулы аўторак пад старшынствам міністра асьветы Добруцкага, адбылося паседжаньне Камісіі Экспэртаў. Тэмай паседжаньня была справа пачатковага школьніцтва на крэсах, а асабліва справа школьніцтва беларускага.

ПОЛЬСКА-РУМЫНСКІ ГАРАНТЫЙНЫ ДАГАВОР. 9 лютага адбылася замена дакумэнтаў, ратыфікуючых польска-румынскі гарантыйны трактат.

За граніцай.

ПАРТУГАЛІЯ. Рэвалюцыя ў Партугаліі з горада Опорто перакінулася ў іншыя гарады. Сытуацыя ўраду ўсё пагоршываецца. Прыказаў ня выпаўняе ня толькі провінцыя, але і сталіца Лісабон. Па ўсім краі адбываюцца забастоўкі і непарадкі. У самай сталіцы дайшло да крывавых сутычак паміж рэвалюцыянэрамі і ўрадовым войскам. Есьць шмат забітых і раненых. Артылерыяй зьнішчана найпрыгажэйшая часьць гораду.

Апошнія весткі даносяць, што ўрадовае войска перамагло рэвалюцыянэраў.

АДРАКАЮЦЦА АД БАЛЬШАВІКОЎ. Як ведама, прэм'ер Італіі Муссаліні вёў з бальшавікамі перагаворы аб розных канцэсіях. Італія нібы абецалася зьмяніць курс адносна С.С.Р.Р. Аднак цяпер, калі Англія абяцала падтрымаць Італію ў розных калёніяльных пытаньнях, — Італія рашуча зьмяніла на горшае свае адносіны да С.С.Р.Р.

ФРАНЦУСКА-НЯМЕЦКІ ГАНДЛЕВЫ ДАГАВОР. Францускі міністар замежных справаў Брыян прыняў нямецкага пасла Гэша, з якім абгаварываў пытаньне аб прадаўжэньні француска-нямецкага часовага дагавору.

ЖЫДОЎСКІ АЎТАНОМНЫ ВОКРУГ У С.С.Р.Р. У Харкаве (Украіна) апублікаваны дэкрэт аб арганізацыі аўтаномнага жыдоўскага вокруга, у склад якога ўвайшлі жыдоўскія земляробскія калёніі. Тэрыторыя новага вокруга раўняецца 48,500 дзесяцінам і падзелена на 7 сельскіх саветаў: 5 жыдоўскіх і два расейскіх. Насяленьне вокруга складаюць 14,800 жыдоў, 1962 расейцаў і 443 немцаў.

БАРАЦЬБА З КОМУНІЗМАМ У ЛІТВЕ. Літоўскі фашыстаўскі ўрад і далей вядзе войструю барацьбу з комуністамі. Гэтак нянаўна было прыгаворана на кару сьмерці яшчэ 4 комуністы.

Аднак прэзыдэнт Сметона памілаваў засуджаных і замяніў ім кару сьмерці на некалькі гадоў вастрогу.

ХВАРОБА СТАЛІНА. Сталін, галава Савецкага ўрада, захварэў на рака. Гэтая хвароба вельмі небясьпечная і невылячымая. Ад раку памёр Фрунзэ — камандуючы чырвонай арміяй.

Хвароба робіць у арганізме бальшавіцкага дыктатара шыбкія поступы.

БУНТ СЯРОД КАНТОНЦАЎ. З Шанхаю паведамляюць, што ў Нанг-Чанг узбунтавалася некалькі тысячаў войска, належачага да кантонскай чырвонай арміі. Некалькі чырвоных камандзіраў забіта. Горад зусім спалены.

Фінансавая праграма ураду.

(*Соймавае паседжаньне 11 лютага.*)

Падчас спрэчак па бюджэту з праграмнай мовай выступіў міністар фінансаў Чэховіч.

Адзначыўшы, што 1926 год быў першым бэздэфіцытным годам (выдаткі не перавысілі даходу), а актыўны гандлёвы балянс (вывозілася заграніцу тавараў на большую суму, як прывозілася) павялічыў запасы Польскага банку з 127 мільёнаў да 310 мільёнаў — міністар перайшоў да абгаварэньня аснаўных пунктаў фінансавага пляну ўрада.

Аснаўныя палажэньні гэтага пляну гэткія: бюджэтная раўнавага без павялічэньня падаткаў, барацьба з ростам цэнаў, атрыманьне заграпічнае пазыкі, стабілізацыя валюты і інш.

Правядзеньне ў жыцьцё гэтага пляну робіцца, але нельга трэбаваць ад ўраду, каб аздараўленьне фінансаў наступіла так хутка, як гэтага ўсім хочацца.

Кажучы аб заграпічнай пазыцы і стабілізацыі валюты, міністар заявіў, што бязумоўнай заслугай сучаснага ўраду зьяўляецца тое, што ён ні ў кога не прасіў пазыкі, а стварыў адпаведныя крэдытныя варункі для не атрыманьня. Цяпер шансы на атрыманьне пазыкі стаяць значна вышэй, чымся стаялі раней.

Фактычная стабілізацыя валюты ўжо наступіла. Польскай валюце нішто не пагражае.

У канцы міністар зьвярнуўся з перасьцярогай да працоўных масаў, зьвяртаючы ўвагу на тое, што аканчальнае палепшаньне іх палажэньня наступіць толькі тады, калі аканчальна будзе ўсталена фінансавае палажэньне.

Павялічэньне заработнай платы можа выклікаць інфляцыю, увесь цяжар якой упадзе на працоўныя масы.

Кітайская разруха.



Гэнэрал Кан-Хсью Ліанг, сын Чан Со-Ліна, які запрапанаваў кантонцам злучыцца з яго арміяй для супольнае барацьбы з Англіяй.

З ГАЗЭТ.

Перасьледаваньне царквы ў С.С.Р.Р.

У сувязі з усіліваючымся перасьледаваньнем царквы ў Саўдэпіі і арыштам мітрапаліта Сяргея, газэта „За Свободу" піша:

Толькі цяпер пацьвердзіліся чуткі аб арышце мітрапаліта Сяргея, толькі цяпер даведаліся мы аб падробнасьцях гэтага арышту.

Як ведама, мітрапаліт Пётр Круціцкі, які замяшчаў памёршага патрыярха Ціхана, ужо даўно заточаны ў Суздальскім манастыры. Мітрапаліт Сяргей быў яго заступнікам. Цяпер чарод дайшоў і да яго. Паведамляюць, што ад гэтага часу, заступнікам Пятра Круціцкага будзе архіепіскап Сэрафім Угліцкі.

Арышт мітрапаліта Сяргея нікога зьдзівіць ня можа.

Ці-ж можна было чакаць ад бальшавікоў, каб яны спынілі перасьледаваньні царквы, а галоўнае, каб яны, так ці інакш азначылі палажэньне кананічнай праваслаўнай царквы ў Расеі.

Уся сутнасьць савецкага рэжыму і складаецца з таго, што ў ім німа ні закону, ні законнасьці. Уся „паўната ўлады" належыць кучцы самадураў, знаходзячыхся на „камандных высотах", і ніхто з шчасьлівых „падданых" ня ведае сваіх правоў, ня толькі ў галіне духоўнага жыцьця, але і матэрыяльнай. Ведае толькі ўсю меру свайго безпраўя Змучыліся крэмлёўскія самадуры „неистовствовать" і падданыя атрымліваюць свайго роду перадышку. Нэпманы пачынаюць бойка гандляваць, вучоныя пачынаюць займацца навукай, веруючыя адкрыта спавядаюць сваю рэлігію.

Настрой на камандных высотах зьмяніўся, і перадышка для падданых канчаецца. Іх ізноў пачынаюць душыць. Нэпманаў ссылаюць і расстрэліваюць, вучоныя павінны ведаць толькі чырвоную навуку, а праваслаўных пачынаюць перасьледаваць.

Гэткім чынам, паўтараем, і ў арышце мітрапапаліта Сяргея неспадзеванага і дзіўнага нічога німа.

Як адазвалася гэтая падзея на палажэньні праваслаўных у Расеі мы ня ведаем. Верым, што калі колькасьць праваслаўных у Расеі дзякуючы перасьледаваньням зьмявшаецца, дык якасьць яе палепшаецца. Верым такжа, што новы заступнік, архіепіскап Сэрафім, будзе з тым-жа мужаствам, што і ягоныя папярэднікі, бараніць кананічныя асновы расейскай царквы.

У С. С. Р. Р.

Кабеты проціў комуністаў.

Галасамі кабет у аўтаномнай Чэчне комуністы пры перавыбарах у саветы праваліліся зусім. Ува ўсе агульныя саветы прайшло толькі 2 комуністы.

„Пратэстуюць".

Пасьля ліквідацыі комуністычных арганізацый у Зах. Беларусі савецкі ўрад арганізаваў ува ўсіх гарадах і мястэчках Савецкае Беларусі дэманстрацыі і мітынгі з пратэстам проці арыштаў.

На мітынгу комсамольцаў у Менску пасьля прамовы сябра калегіі Г. П. У. Пострэйтэра, старшыні рэввоенсавета Калініна і быўшага пасла польскага Сойму Кахановіча — комсамольцы падзёрлі польскі і англійскі нацыянальныя флагі і разьбіла спэцыяльна прыгатаваныя бюсты Пілсудскага і англійскага караля. Пасьля гэтага таўпа са сьпевам інтэрнацыяналу і варожымі Польшчы выкрыкамі прайшлася па менскім вуліцам.

Экстрэннае паседжаньне сябраў Інбелкульта пастанавіла трэбаваць прылучэньня Зах. Беларусі да С.С.Р.Р.

Па распараджэньню вайскавага камандаваньня былі арганізаваны мітынгі і сярод чырвонаармейцаў. Чырвонаармейцы, ведама, галасавалі за рэзалюцыі з трэбаваньнем аб'яўленьня вайны Польшчы!

Арышт мітрапаліта Сяргея.

Пасля няўдачнай спробы зрабіць раскол у царкве шляхам утварэньня „часоваг-

Апошнія навіны.

У Польшчы.

ПЕРАРЫЎ ПОЛЬСКА НЯМЕЦКІХ ГАНДЛЕВЫХ ПЕРАГАВОРАЎ. Нямецкі ўрад вырашыў перарваць польска-нямецкія гандлёвыя перагаворы, матывуючы гэта той пазыцыяй, якую заняла Польшча ў пытаньні аб высяленьні нямецкіх грамадзян.

ГЭН. СОСНКОЎСКІ — ДЭЛЕГАТАМ ПОЛЬШЧЫ ў ЛІГУ НАРОДАЎ. Прэса падае, што ў сучасны мамэнт ужо аканчальна вырашана пытаньне аб вызначэньні гэн. Соснкоўскага прадстаўніком Польшчы пры Лізе Народаў замест Сокаля. Разам з тым наагул робіцца актуальным пытаньне аб актыўнай працы гэн. Соснкоўскага ў дзяржаўным і палітычным жыцьці. Цяпер Соснкоўскі знаходзіцца на Рывьеры, дзе лечыцца ад раны, атрыманай падчас майскага перавароту.

Песьня аб донне Інэзе.

(бальляда).

У замку прыгожым
Ў Гішпаніі далёкай
Графіня Інэза жывець. —

Ды траур ў тым замку
І змрок і сумнота,
Бо нельга сьмяяцца, ні пець.

Графіня ў малітвах
Праводзе гадзіны,
З ружанцам пацеры вядзе.

А твар яе бледы,
А погляд ўсьцяж сумны
Усьмешкай людзям ня блісьне!

Так, ў вопратцы чорнай,
Па залям замковым
Плыве дзесь, у процьму глядзя.

А служба трывожна
Прад ёю гне шыю,
Хоць к усім міласэрна яна.

Так, некалькі год ўжо
Сум ўладу спраўляе,
Са дня як рукою прадажнай

Ў горах, ў яры глухім,
Быў забіт' яе муж
Дон Пэдро да Гомэц адважны.

І доўга ўсе гэтак
У замку трывала,
Аж неяк, у час веснавы

Прыкмеціў вартоўнік
Са сьценаў замковых
Гурток падарожных ў пылі.

Дазналісь: пасьля
Крыжавога паходу,
Няверных збароўшы палкі

Вяртаў пераможцам
З краіны далёкай
Рамон Пэрголезэ ўдалы.

Бы Тэб той прыгожы,
„Бы тыгр — лоўкі, дужы,
„Ен гутарку з доннай вядзе:

„Змарыліся коні
„І людзі паслаблі,
„Асады-ж ня відна нідзе!

„Дык ветліва просіць
„Прыгожу ўладарку
„Дазволіць у замку начлег"...

Зірнуўшы, згадзілась
Інэза адразу:
„Крыжоўцам адмовіць?! то-ж грэх!!"

Падчас жа абеду
З яе вусн суровых
Імкнуў звонкі соладкі сьмех.

Калі-жа к вячэры
З кружганкаў схадзіла,
Саромючысь бы маладэтка,

На вопратцы чорнай,
Прышпілена к грудзям,
Ірдзела чырвоная кветка...

. . . .

Аднак-жа на заўтра,
Яшчэ раніцою,
Ад'ехаў дон Рамон з дружынай,

І хутка ўвесь гурт тых
Ваякаў адважных
Расплыўся у воддалі сіняй...

. . . .

З тэй пары замак ўвесь
Яшчэ больш пачарнеў,
Інэза яшчэ больш зьбялела,

На высокім чале,
Над брывёю крутой,
Няпрыкметна маршчынка асела

Ды хоць вочы Інэзы,
Няраз ў даль глядзяць,
На рэсьніцах няраз віснуць сьлёзы,

Ня прызнаецца яна
Чаму гэта тады
Прышпіліла к грудзям кветку розы...

Я. Сьветазар.

Вільня, Студзень 1927 г.

ФІНАНСЫ і ГАСПАДАРКА.

Мэліорацыя ральлі.

Ня гледзячы на тое, што 64 працэнты насяленьня ў Польшчы складаюць земляробы, і што земляробства гуляе вельмі паважную ролю ў дзяржаўнай гаспадарцы, урад не зьвяртае да гэтай пары належнай ўвагі на гэтую галіну прамысловасьці. Адносна дабычы земляробскіх прадуктаў Польшча стаіць далёка ў хвасьце за многімі, значна меншымі, эўрапэйскімі дзяржавамі. Так напр. ураджай 1926 г. Італіі складае 25,500,000 мэтрычных цэнтнараў, Румыніі — 13,500,000, Юга Славіі — 9,700,000, Вэнгрыі — 8,400,000 і Польшчы—6,800,000. А між іншым абшар Італіі раўняецца толькі 311,000 кв. кілам., Румыніі — 294,000 кв. кілам. Юга-Славіі — 249,000, Вэнгрыі—93,000, а Польшчы—386,600 кв. кілам. З усіх гэтых дзяржаваў толькі адна Італія мае большы лік насяленьня, каля 42 мільёнаў жыхароў, у той час як Юга-Славія—12 міл., Румынія—16 міл., Вэнгрыя—8 мільён., а Польшчы—30 мільёнаў.

З гэтага кароткага сапастаўленьня лічб відаць, як нізка стаіць земляробская прамысловасьць у Польшчы, якая, маючы ўсе даныя для яе разьвіцьця, амаль што ні кожны год мусіць прывазіць хлеб з такіх краёў, як Вэнгрыя, Румынія, Юга-Славія і Баўгарыя. Вось дзеля чаго зусім правідлова была зьвернута многімі послами ўвага ўраду на мэліорацыю ральлі, пры апошняй дыскусіі ў Сойме над бюджэтам зямельных рэформаў, земляробства, публічнай працы і прамысловасьці. Даволі для ілюстрацыі ўказаць на тое, што у Польшчы маецца 1,108,754 гэтак званых карлаватых ці зусім непладародных гаспадарак. Паводле аблічэньняў праф. С. Турчыновіча на падставе даных, сабраных міністэрствам земляробства, маем для мэліорацыі, ці паляпшэньня шляхам асушкі і арашэньня каля 18 мільёнаў гэктараў зямлі, якая пасьля мэліорацыі дала бы падвышку земляробскіх прадуктаў каля 120 мільёнаў квінталаў у год. Лічачы цану квінтала земляробскіх прадуктаў ў сярэднім у 3 даляры, атрымаем надвышку земляробскіх прадуктаў ў разьмеры 360 мільёнаў даляраў, ці пры цяперашнім курсе даляра 9 зл. дасьць 3,240 мільёнаў зл., што амаль у два разы перавышае ўвесь дзяржаўны гадавы бюджэт.

Пасьля мэліорацыі ўраджайнасьць ральлі павялічываецца на 60 — 100 процантаў. Досьлед паказаў, што тарфяныя балоты пасьля мэліорацыі даюць у 2—3 разы больш сена, чым звычайныя сенажаці. Гэтакія самыя вынікі даюць і пяшчаныя грунты пры штучным арашэньні і ўгнаеньні. Мэліорацыйныя абшары не баяцца ні засухі, ні дажджоў. І такія абшары ніколі не ведалі-бы неўраджаяў. Гэта ў першую чаргу датычыцца беларускіх зямель, маючых шмат балотаў і пяскоў.

На мэліорацыю аднаго морга патрэбна каля 200 зл. Калі-б скарб зрабіў спэцыяльна для гэтай мэты заграўнічную пазыку ў 1 мільярд зл., дык гэты доўг, як мы бачылі, быў бы зьвернуты у 1—2 гады. Нават хоць бы тыя 60 мільёнаў зл., якія асыгнаваны на бюджэт працы, пайшлі на мэліорацыю, дык гэта дало бы працу безработным і значна падняло бы земляробскую гаспадарку.

Наагул мэліорацыя мае вельмі шмат карысных бакоў: дала бы працу безработным, якім выдаецца дарма дзяржаўная запамога і ім ня трэба было бы эміграваць за граніцу для шуканьня працы. Значна аздаравіла бы клімат, асабліва ў нас на Палесьсі. Аздаравіла бы гарады, з якіх па трубам, а пасьля канавам расходзіліся ўсе нячыстасьці, якімі можна было бы ўдабраць паля. Мэліорацыя падняла бы заможнасьць сялян, вёскі, якая была больш здольнай для патрабленьня прамысловых артыкулаў. Гэткім чынам устанавілася бы, як тыя бальшавікі называюць, „смычка" між вёскаю і местам. Павялічылася бы паёмнасьць унутранага рынку; дзяржава унезалежніла—бы сябе ад вонкавага рынку і гэткім чынам быў—бы зусім зьліквіданы эканамічны крызіс, якога да гэтай пары ня ведае Францыя, вельмі падобная на Польшчу па сваім прыродным багацьцям, адносінамі між земляробскай і фабрычнай прамысловасьцю. І на усё гэта патрэбна каля 7 мільярдаў злотых, якія па скančэньні работаў маглі бы быць зьвернуты ў працягу 2—3 гадоў. А між тым да гэтай пары ні ўрад, ні самаўрады не зрабілі для гэтай падставы ўсей нашай гаспадаркі роўна нічога. Гэта недбайства, якога нельга даравацць.

S.

Пасеўныя крэдыты для земляробаў пацярпеўшых ад неураджаю.

Міністэрства земляробства вызначыла для Віленскага ваяводзтва 1 міл. зл. на пасеўную запамогу тым з дробных гаспадарак, якія пацярпелі ад неўраджаю ў 1926 г. Гэты крэдыт можна атрымаць у пастаці гатоўкі і зярна. Разьдзел між асобнымі староствамі паверaны віленскаму ваяводзе. Старосты на падставе апініі павятовых камітэтаў земляробскае помачы зробяць далейшы разьдзел вызначаных на павет крэдытаў між пацярпеўшымі так, каб у першую чаргу карысталіся імі тыя з земляробаў, якія да гэтага часу пасеўнымі крэдытамі не карысталіся, ці атрыманыя крэдыты зусім выплацілі. Тым жа з земляробаў, якія яшчэ не разьлічыліся з папярэднімі крэдытамі, могуць быць выдадзены новыя пазычкі толькі ў выключных выпадках. Тэрмін зварота выданых крэдытаў вызначаны да 1 сакавіка 1928 г., процант - 2,5 гадавы. Адначасна міністэрства земляробства вызначыла на пасеўныя крэдыты для Наваградзкага ваяводзтва 500,000 зл.

Падаткі у лютым 1927 г.

Міністэрства скарбу напамінае, што ў лютым 1927 г. трэба плаціць наступныя простыя падаткі:

1) Ад 15 лютага да 15 сакавіка першую рату дзяржаўнага грунтовага падатку за бягучы год.

2) У працягу лютага (да 28 уключна) падатак за нярухомасьці гарадзкія і некаторыя вясковыя за 4-ты квартал 1926 г.

Апрача таго тыя падаткі, на якія платнікі атрымаюць платнічыя наказы з датай ўплаты ў лютым, ці часткі падаткаў адсрочаных і разложаных на раты з тэрмінам уплаты ў гэтым месяцы.

Біржа.

16 лютага

Даляры	8, 92 зл.
Залаты рубель	4, 72 зл.
Сярэбраны рубель	2, 88 зл.
Чырвонец	35, 95 зл.

Збожжа

(Варшава)

Жыта (100 кілагр.)	— 39 зл.
Пшаніца „ „	52 — 53 зл.
Ячмень браваровы	36 — 37 зл.
Ячмень крупяны	31 — 32 зл.
Авёс „ „	31 — 32 зл.

(Віленшчына)

Жыта (100 кілагр.)	42 — 43 зл.
Пшаніца „ „	50 — 51 зл.
Ячмень брав.	33 — 34 зл.
Авёс „ „	37 — 38 зл.

Кат Расеі.



Фатаграфія Ф. Дзержынскага, ката Расеі—які стаяў на чале Чэкі. Чэка загубіла некалькі мільёнаў чалавек.

Чытайце і пашырайце „Беларускае Слова.

найвышэйшага царкоўнага савету", бальшавікі перайшлі без усякага поваду да простых рэпрэсіяў проці царквы. Перасьледаваньні бальшавікоў абрушыліся найраней на іерархію, арыштамі сярод якой савецкая ўлада думае пашкодзіць царкве.

Прыступленьне высокапраасьвяшчэннага мітрапаліта Ніжагародзкага Сяргея да выпаўненьня абавязкаў намесьніка патрыярха да некатарай меры прывяло ў парадак царкоўнае жыцьцё ў Расеі. Прынятыя мітрапалітам Сяргеем крокі да ўпарадкаваньня царкоўнага жыцьця, здавалася, гарантавалі ёй магчымасьць аканчальнага і нармальнага забасьнаваньня арганізацыйнае стараны царкоўнага жыцьця. Г. П. У. зьвярнула на гэта ўвагу і рэпрэсіі былі зьвернуты проціў мітрапаліта Сяргея.

Яшчэ ў 1926 годзе мітрапаліт Сяргей быў выкліканы з Ніжняга Ноўгараду да Масквы. Тут мітрапаліту быў прад'яўлены рад ультыматыўных трэбаваньняў і прадастаўлены нейкі час для атрыманьня адказу.

Бальшавікі трэбавалі, каб мітрапаліт Сяргей адлучыў ад царквы ўсё праваслаўнае духавенства па замежамі С.С.Р.Р. Калі мітрапаліт адмовіўся зрабіць гэтае — яго арыштавалі.

ЖЫЦЬЦЁ ПРОВІНЦЫІ.

Ліда.

У канцы месяца студня на адлеўні жалеза Шапіро ў Лідзе каля пераезду чугункі здарыўся гэтакі выпадак. Перад пачаткам працы працаўнікі адлеўні заўважылі, што на плату вісіць неякі шматок тканіны. Калі-ж зьнялі яго, то ўбачылі, што гэта быў чырвоны сьцяг з комуністычнымі напісамі. У хуткім часе прыляцела на мейсца здарэньня паліцыя і пачала рабіць дазнаньне—хто гэта мог зрабіць, адкуль і дзе жыве. Але да апошняга часу праступнікаў ня выкрылі. І як гэта ня дзіўна, тутэйшая палітычная паліцыя падазрэвае ў гэтым ні комуністаў, якія гэта заўсёды робяць, але звычайных сяброў Лідзкага Беларускага культуна асьветнага гуртка „Прасьветы"!.

Як усім ведама гурткі „Прасьветы" наагул ні маюць нічога супольнага з ворагамі Дзяржавы комуністамі і іх кумпанамі грамадзістамі! Працу сваю гурток Лідзкае „Прасьветы" вядзе выключна на полі культурнаасьветным у межах дазволенага ўладаю статуту і заўсягды ў адносінах да Дзяржавы быў, як і іншыя нашы гурткі „Прасьветы", лёяльны.

Што гэта так, аб гэтым сьведчыць зьмест нашае газэты „Беларускае Слова", зьезд у Вільні прадстаўнікоў ад усяе Заходняе Беларусі дваццаць сёмага і восьмага чэрвеня леташняга году, вострая барацьба з комунізмам і яго правадырамі нашай Беларускай Нацыянальнай Рады, адозвы ад імя гэтай самай Рады да ўсяго беларускага народу, каб ён ведаў, хто яго ашуківае, зьезд прадстаўнікоў Беларускай Нацыянальнай Рады ў Баранавічах ад Наваградчыны восьмага і дзевятага лютага гэтага году, які вынес пастанову змагацца з комунізмам і яго прыхвасьнямі грамадаўцамі і ўся нашая папярэдняя праца, якая як я ўжо казаў ідзе ў напрамку барацьбы з комунізмам.

Дык толькі той, хто гэтага яшчэ ня ведае, можа рабіць нам гэтыя сьмешныя і часам глупыя закіды ў працы супроць Дзяржавы і падазрэваць у анты-дзяржаўных праступках!

Напісаў гэта, каб тыя — кто апекуюцца намі і сачаць за парадкам у нашым месьце Лідзе—раз на заўсёды ведалі, хто мы такія і з чым мы змагаемся!

Старшыня Лідзкае „Прасьветы"

Кастусь Маеўскі.

Грамадаўскія ашуканствы.

(Баранавічы.)

Групай жыхароў Барановіч быў высланы да рэдакцыі „Сялянская Ніва" ліст, у якім апісывалася гэткае грамадаўскае ашуканства: Мясцовы камітэт Грамады фальшаваў подпісы на дэклярацыях аб уступленьні ў Грамаду. Гэткім чынам атрымліваліся партыйныя білеты і Грамада „расла"...

Аб усім гэтым мы напісалі і падпісаўшыся выслалі да рэдакцыі „Сялянскае Нівы"

Да гэтага часу ў „Сялянскай Ніве" пісьмо нашае зьмешчана ня было.

Баранавіцкія

Грамадаўскія пагрозы.

Рэдакцыяй атрымана ад нашага карэспандэнта з Баранавіч Янкі Тарасава гэткае пісьмо:

Паважаны Пане Рэдактар! 5 студня а 2 г. папалудні выйшаў я на рынак, захапіўшы з сабой 5 нумароў газэты „Беларускае Слова". Навокал мяне сабралося некалькі сялян, якія пачалі мяне распытываць, што гэта за газэта. Я ім ахвотна вытлумачыў—што гэта газэта Беларускае Нацыянальнае Рады і расказаў да чаго Б. Н. Рада імкнецца. Выслухаўшы мяне сяляне разабралі ўсе газэты, так што нават ня хопіла.

Падходзіць тады да мяне нейкі, відаць, грамадавец і таксама пытае, што гэта за газэты Вы прадавалі?—Беларускае Нацыянальнае Рады, адказаў я яму — каторая стаіць у абароне нашых сярмяжных братоў беларусаў.

Гэта адзіная арганізацыя, каторая нас не ашуківаець—не так, як комуністычная Грамада, якая замест абяцаных палёгак давяла многіх да вастрогу. Грамада на свой комунізм надзела нацыянальную маску і такім чынам ашукала многіх.

Тады гэты грамадавец вельмі разззлаваўся і накінуўся на мяне, але сяляне дружна паўсталі проці яго кажучы:

Гэта платны агэнт Грамады. Даволі мы за вас нацярпеліся і г. д.

Так што пайшоў гэты грамадавец, адкуль прыйшоў—бы тая абшчыпаная курыца.

Крыху пазьней разьвітаўшыся з сялянамі я скіраваўся да дому.

Аж раптам падлятае да мяне Міхась Васілевіч — платны грамадаўскі агэнт і крычыць:

— Чакай, будзе табе і тваей Нацыянальнай Радзе. Ведай што цябе чакае - сьмерць... Фашысты вы гэтакія...

Далей Васілевіч ірыгразіў, што як прыдзе час, дык мяне першага павесяць.

Я тады яму адказаў:

— Барацьбітам, якія пацярпелі ад комуністычных здраднікаў—чэсьць і слава.. А гэтыя пагрозы нам не страшныя. Усіх не паэабіваеш. Забіты Іголка, Скарына, Смолік — але на іх месцы зьявіліся дзесяткі іншых.

А што Грамада праводзіць тэррор, —гэта новы доказ, што гэтая партыя да дабра нас і нашае сялянства не давядзець.

З пашанай

Янка Тарасаў

Маленькі фэльетон

Хто я такі ёсьць.

(ўспаміны з памятнае кніжкі старога беларуса)

Восень 1914 году. Прыйшлі Маскалі... Лічучы мяне за свайго не пыталіся, хто я такі ёсьць, але забралі карову, выдалі нейкі квіток і пайшлі далей...

Казалі, што вайна хутка скончыцца..

Восень 1915 году. Маскалі йшлі назад, але адходзілі хутка і азіраючыся.. Квіткоў ужо не выдавалі ніякіх, а хапалі ўсё, што пападалася пад руку... На другі дзень прыйшлі немцы, апісалі ўсю маю маемасьць і пытаюцца: як я завуся і хто я такі

—Тутэйшы я, паночкі, кажу, тутэйшы.. Тутака і мае бацькі і мае дзяды...

— Ты... Rusisze Schwejn *) — абарваў мяне немец—heraus! . і запісалі што я маскаль..

Лета 1916 году, Той самы немец, калі прыйшоў па яйкі і масла, пытаецца якой я веры. .

— Каталіцкае — кажу..,

— Дык ты—кажа—паляк?!..

— А Бог яго ведае!.. Тутэйшы я.. тутака мае бацькі.. дзяды — пачаў я ізноў яму, але не далі скончыць. Запісалі паляком..

Зіма 1917 году. Ізноў немцы рабілі перапіс.,. Казалі, што тутака, быццам, Літва. Запісалі літвіном,..

Зіма 1918 году. Паварочаліся нашыя хлопцы з вайны... Тыя, што прыехалі з Нямеччыны мелі паперы, што яны літвіны, а тыя, што з Расеі, што яны беларусы... А ксёндз... дык кажа, што мы ўсе — палякі.. Нічога не разумею .,

Пачатак 1919 году, Зразумеў нарэсьце—прыйшлі бальшавікі і абвесьцілі што мы ўсе ёсьць „літбелы"... Гэта нешта ніто літвіны, ніто беларусы...

Вясна 1919 году. Наляцелі палякі і стаўся я „вольным і роўным"... Калі шукалі „царскіх" грошаў, пытаюцца якой я веры і да якога народа належу...

— Астатні раз—кажу я ім—я быў „літбелам", а перад гэтым паляком, а запраўды, паночкі, я ёсьць толькі тутэйшы, бо сам я тутака радзіўся, тутака радзіліся мае бацькі, дзяды.. дый і гаварым ўсе мы па тутэйшаму.

— Так, так — згаджаюцца — ty jesteś prawdziwym polakiem z ziem wschodnich...

Гэтак і запісалі,..

Лета 1920 году. Навaліла, „таварышаў".. Галодныя і абдзёр тыя... Але няма ўжо—ні палякоў, ні літвіноў, ні тутэйшых.. няма нат і „літбелаў"...

Ідуць заўтра браць „Аршаву", а тагды ўжо канец усяму будзе, толькі адзін саўдэп па цэлым сьвеце,.

Паказаліся і літвіны...

Восень 1920 году. Кажуць, быццам, войскі Пілсудскага ўзбунтаваліся і я дзеля гэтага стаўся „Сярэдня літоўцам"...

Восень 1921 году. Наехала шмат розных паноў..Адны кажуць: „калі хочаш даведацца запрауды, хто ты такі ёсьць, дык галасуй—кажуць — за Віленскі Сойм, і ён табе скажа гэта"... Але іншыя, а асабліва тыя, што так хараша гавораць па нашаму, баялі, што гэта быццам прадстаўнікі Віленскіх беларусаў, дык тыя кажуць на адварот: „не галасуй — намаўляюць —бо ніякі Соім і ніхто іншы, а толькі мы, дый вось і вы ўсе, што гавораць па тутэйшаму, толькі мы самі і можам сказаць хто мы такія ёсьць... і прыйдзе час, і мы гэта скажам, дый ня тутака да вашае вёскі, а ў іншым мейсцы, дый на цэлы сьвет"... Маўчым гэта мы, дый пазіраем адзін на аднаго.. А хлапцы парасчынялі роты, а вочы блішчаць, блішчаць— відаць падабаліся ім і прадстаўнікі беларускія і іхнія прамовы...

—Нашыя.. гэта нашыя—пачалі шаптацца

А тутака пад'ехау яшчэ адзін пан з газэтамі „Jedność" , дый як пачаў лаяць і тых што хочуць галасаваць і тых, што ня хочуць. А сам усё падсоўвае свой сьпісак...

— Не!...—Думаем сабе — ўжо і тыя, што гавораць па „нашаму" ня могуць нешта падзяліцца дык трэба быць асьцярожным..

І парашылі ўсе, як адзін, устрымацца ад выбараў у Віленскі Сойм...

1922 год. Галава зусім пайшла кругом... Ізноў паноў у нас паўнюсенька і кожны заклікае, каб галасавалі-бы ў Сойм Варшаўскі... Але-ж навошта і за каго?!...

Адзін кажа: „вызвальню" я цябе з ўселякага ліха і зажывеш ты ў сваім краі як у раі...

Другі: „адраджу"—кажа—і будзеш жыць бяз гора і заботаў, як толькі што народжаны ..

Трэці — дае адразу і зямлю і фабрыкі і ўладу, толькі галасуй за ягоны сьпісак...

А ксёндз з амбону: „не галасуй—кажа—а ні за які сьпісак, апрача нашага.. Бо рай ты дастанеш толькі ад Бога, дый і то на тым сьвеце.. А ад гора і заботаў, калі ні Бог, дык толькі сьпісак № 8 можа пазбавіць... і г. д. і г. д.. Панавозілі газэтаў, кніжак, абвестак і ўсё ў панскай мове і ходзяць хлапцы, як зачумелые і няведаюць, што і як рабіць...

А тым часам над'езджаюць і нашыя знаёмыя—прадстаўнікі ад беларусаў...

(далей будзе)

Г.—на.

*) Руская сьвіньня.

Як адбывалася санацыя Слонімскага самаўраду.

У 1925 годзе быў вызначаны ў нас староста Пшэцішэўскі, каторы распачаў сваю працу з таго, што адразу зьмяніў бышых гмінных пісароў, нешта каля 10. Людзі кажуць, што некаторых і варта было звольніць, але некаторых і не.. Быў выпісаны аж занадта спраўны новы гмінны інспэктар п. Счэпаньскі, каторы добра скарыстаў з гэтае акацыі. Кажуць, што зрабіў добрыя інтарэсы.

Але як быў звольнены староста, дык і інспэктара „ветліва“ папрасілі пазбавіць нас сваёй прысутнасьці

А не задоўга да гэтага застрэліўся касір выдзялу, і ўсе гаварылі, што непарадкі ў „выдзяле“ паслужылі гэтаму прычынай; быў звольнены такжа і „кеўнік выдзялу“ п. Г., а здаецца дзеля таго, што не хапала 450 зл пэнсіі ў месяц.

Вось якія парадачкі былі ў нашым самаўрадзе. Цікава, ці і далей так пойдзе. Веры да гэтага самаўраду ў людзей надта мала ёсьць.

Юрка Бусел з пад Слоніма.

Макаркі...

(*Залесье, Маладэчанскага пав.*)

Здараюцца ў нас на беларускіх вёсках людзі, каторыя робяць прост немагчымым жыцьцё сваім аднасяльчанам. Гэта найбольш, авантурныя тыпы, праца на ральлі каторым вельмі не да смаку. Ім хочацца лягчэйшага заработку. Дык і ня рэдка пападаюць гэткія людзі ў сышчыкі, безпадстаўна даносяць на ўсіх навокал; паліцыя арыштоўвае, ўзаемаадносіны паміж насяленьнем і ўладай уканец псуюцца.

Падобны тып ёсьць і ў нас ў в. Міхнічы. Завуць яго ўсе Макаркай. Мае гэты Макарка кавалак зямлі, але на ёй не працуе: шукае іншага і больш ганаровага занятку. А іменна служыць тайнікам у паліцыі і апрача таго крадзе...

Аб тым, каму толькі ён не нашкодзіў даносамі—гаварыць ня будзем Напішу толькі аб апошнім ягоным дэбюце.

А ласьне: Зусім нядаўна Макарка абрабаваў пасеку ў маёнтку Залесье. Павыцягіваў з вульляў увесь мёд і пчол нават непашкадаваў, бо потым у ягонай лазьне знайшлі кучы мёртвых пчол.

Пасьля крадзежы Макарка проста купаўся ў мёдзе. Падараваў нешта з 15 фунтаў і мейсцоваму камэнданту паліцыі.

Але хутка даведаўся аб гэтым упраўляючы маёнткам Берастоўскі і заявіў паліцыі. Аднак паліцыя не захацела зачапіць „свайго“ і толькі пагрозы Берастоўскага зрабіць адпаведныя крокі ў Вільні прымусілі паліцыю арыштаваць Макарку. Пасьля арышту быў зроблены вобыск, прычым у Макаркавай лазьні знайшлі шмат мёртвых пчолаў і рамаў ад мёду.

Пратрымалі Макарку ў арышце пару дзён і выпусьцілі. Гуляе ён цяпер на свабодзе і ізноў шкодзіць людзям.

Заноза.

Асьцярожна з Амэрыкай.

Адзін з нашых карэспандэнтаў атрымаў ад нядаўна выехаўшага „амэрыканца“ пісьмо. Між іншым той піша;

Як толькі выехаў, дык усё было добра. У дарозі кармілі надта добра. Давалі 2 разы ў дзень віно і г. д

А як прыехаў на мейсца, дык аказалася зусім інакш. Як быў на бацькаўшчыне і меў сваю зямлю, якая цяпер прадана — хапала і хлеба і да хлеба. А тут мовы англійскае не разумею. Безрабоцьце страшэннае. На біржы заўсёды таўчэцца шмат безработных. Хто мае даляры, хутчэй пападзе на працу пры помачы агэнта. Добра яшчэ, што маю крыху даляраў за прададзеную зямлю, дык неяк перабіваюся. Каб хутчэй-бы хаця вярнуцца на Бацькаўшчыну.

Трэба асьцерагацца розных агэнтаў, якія заклікаюць ехаць ў Амэрыку, абяцаючы шмат чаго. А як прыедзе чалавек на месца, дык хоць тапіся...

Дабрадзействы Грамады.

У в. Кавалі Дзісьненскага пав. за нелегальны грамадаўскі сход пакараны гэткія асобы: старшыня Ф Шахалай—2 месяцы турмы, скарбнік Арцём Піскуновіч — 1 месяц, сэкрэтар Е. Леднік—1 месяц, а рэшта сябтаў па 20—30 зл.

У в. Драгабыль Баранавіцкага пав. арыштавана 4 асобы, з якіх Антон Дрозд і Іван Жыўла сядзяць і дагэтуль.

Грамадавец дзяком.

Грамадзянін нашай вёскі П. Д. злажыў, як чутно, просьбу архірэю аб пасадзе на дзяка

Як ведама гэты П. Д. зьяўляецца сябрам Грамады, каторая не прызнае Бога і рэлігіі і брудзіць царкву і духавенства. Якжа гэта так?

Б.Б.

Ад рэдакцыі:

Шчыра радзім п. П. Д. зараз жа кінуць Грамаду, а атрымаўшы пасаду, добра пакаяцца ў сваіх папярэдніх грахах.

Тутэйшая хроніка.

Прымусовага нядзельнага адпачынку ня будзе. Як ведама, да гэтага часу ў нядзелю ўсе крамы павінны былі быць зачынены. Аднак жыдоўскія дэлегаты ўжо даўно дабіваліся права гандляваць і ў сьвяты. Цяперака камісія па справам нацыянальных меншасьцяў пастанавіла ўнясьці прапазыцыю аб дазволе адчыняць магазыны ў нядзельныя і іншыя сьвяточныя дні ад 1 да 5 гадзіны.

Абарона лясоў. 28 лютага адбудзецца паседжаньне ваяводзкае камісіі абароны лясоў, на якой будуць разглядацца просьбы аб вырубке лясных вучасткаў.

Памірае два з паловай чалавека што дзень. Па статыстычным даным у гарадзскіх шпіталях Вільні памірае штодзень два з паловай чалавека.

Мовы нацыянальных меншасьцяў. „Віленское Утро“ падае, што міністэрства ўнутраных справаў распарадзілася, каб урадоўцы ўсходніх ваяводзтваў навучыліся беларускай і ўкраінскай мовы. Да і тэрэсантаў прапануецца зварачвацца на дзяржаўнай мове, а калі інтэрэсант не разумее—дык трэба гаварыць на мове мясцовае нацыянальнае меншасьці.

Атруцілася дэнатуратам 15 чалавек 6 лютага ў Мар'і Эсмановіч (в. Рыкасеўшчына, Краснасельске вол.) на вясельлі гасьцям быў пададзены дэнатураваны сьпірт. Ужо на другі дзень усе піўшыя зьляглі ў ложка і 8 памерла. На другі дзень памёрла яшчэ 7 чалавек. Больш дзесяці знаходзіцца пры сьмерці.

Сярод памёршых знаходзіцца і жаніх 28-х гадовы Базыль Сушка. А маладая, каторая сьпірту ня піла—ўцалела.

Грамадаўск'я арыштаваныя паслы перавязяны да Пазнані. У суботу 12 лютага грамадаўскія паслы: Гарашкевіч, Рак Міхайлоўскі, Галавач, Мятла і Валошын перавезены ў Пазнанскую турму.

І „Вызваленьне“ не падабаецца.

На імя старшыні Беларускае Нацыянальна Рады п. Паўлюкевіча паступіла гэткая заява ад б. вызваленца Браніслава Шарэцкага:

Паважаны Пане Старшыня!

Прашу надрукаваць у „Беларускім Слове“ наступнае:

Перакана ўшыся ў бяздзеяльнасьці „Вызваленьня“, а такжа ў тым, што гэтая партыя нічога добрага нам не дала, выходжу са складу сябраў Слонімскага гуртка „Вызваленьня“.

Адначасна прашу залічыць мяне ў лік сябраў Т-ва „Прасьвета“ і сэкрэтарыяту Беларускай Нацыянальнай Рады.

Усіх шчырых і чэсных беларусаў—вызваленцаў заклікаю зрабіць тое самае—пакінуць „Вызваленьне“ і еднацца каля нашай Нацыянальнай Рады.

Браніслаў Шарэцкі.

в. Медвінавічы, Слонімскага пав.

Гуртток „Прасьветы“ у Баранавічах.

З'арганізаваўся ў Баранавічах гурток Беларускага Т-ва „Прасьвета“. Да гэтага часу ў гурток запісалася больш 30 сябраў.

На старшыню гуртка абраны гр. Васіль Плаўсюк (зав. Траўгутта № 9), да якога і можна зьвяртацца па усім справам.

Пры гуртку арганізуецца бібліятэка.

Шпіёнская арганізацыя на Віленшчыне.

Апошнімі днямі ўлада ліквідавала шпіёнскую арганізацыю, якая працавала на абшары Віленшчыны і Горадзеншчыны. Праца вялася на карысьць Савецкае Расеі.

Цэнтральная арганізацыя знаходзілась ў Вільні. Усяго арыштавана 8 асоб цывільных і 4 вайсковых.

На чале арганізацыі стаяў сябра Г. П. У, у Менску.

Паміж шпіёнскай арганізацыяй і Менскам сувязью былі спэцыяльныя, добра аплачываныя кур'еры. Арганізацыя займалася зьбіраньнем матэрыялаў, датычачых войска і жалезнадарожнае камунікацыі.

Пры арыштаваным дэлегаце Г. П. У. знойдзена вялікая колькасьць рожнага роду фатаграфіяў. Сярод арыштаваных цывільных асобаў знаходзяцца два кантрактовых служачых з віленскай жалезнадарожнай дырэкцыі, а між іншым Уладзімер Чвалько—беларус па нацыянальнасьці. Дастаўляў ён Г. П. У. матэрыялы датычачыя жалезнадарожнае камунікацыі.

„Kurjer Wileński“ падае, што паміж арыштаванымі ёсьць 2 сябры Грамады.

Уся справа падзеляна на 2 часьці і адаслана адна да Акружнога Суда ў Вільні, другая жа да Вайсковага Акружнога Суда ў Горадні.

ГУТАРКІ АБ ГАСПАДАРЦЫ.

У прошлым нумары мы паказалі, як без аналізу грунта можна даведацца, якія штучныя навозы больш патрэбны.

Цяпер нашым заданьнем зьяўляецца пазнаёміць чытачоў за штучнымі навозамі і як і калі іх трэба ўвозіць у зямлю.

Азоцістае ўгнаеньне.

Гэта соль, якая прывозіцца з Паўднёвай Амэрыкі, гдзе найбольш яна знаходзіцца ў Чылі і Пэру.

Чылійская салетра мае ў сабе 15—15,9 прац. азоту. Ужываць яе можна на ўсіх грунтох, апрача мокрых. Найлепш памагае на суглінiстых, горш на пясчаных грунтах. Рассыпаць яе трэба ў сухую пагоду, прычым адну палову ў часе сяўбы, другую калі палчынае збожжа рунець. На дзесяціну даецца пры слабым угнаеньні 3 п., пры сярэднім — 6 п., і пры моцным 12 п., памагае ў працягу 1 году.

Фосфарна-квасныя угнаеньні.

Супэрфосфат. Цёмна-шэры парашок з удушлівым пахам. Мае ў сабе 14—20 прац. фосфарнага квасу.

Супэрфосфат можна ўжываць на ўсіх грунтах апрача квасных. Даецца пад усе расьліны найбольш тады, калі патрабуецца хутчэйшае пасьпеваньне. Пад азімыя рассыпаецца восеньню, пад яравыя вясной. На дзесяціну патрэбна 12—18—24 пуды.

Памагае ў працягу 2—5 гадоў? Нельга высеваць разам з вапнай і тамашлякам.

Тамашляк — цяжкі цёмнашэры парашок, які мае ў сабе 16—17 прац. фосфарнага квасу і 40—45 прац. вапны. Ужываецца на квасных тарфяных, лугавых, бедных вапнаю, а таксама на лёгкіх, сухіх і пяшчаных. грунтох.

Можна ужываць пад капусту, буракі, канюшыну, кармовыя расьліны, пад яравое і азімае збожжа.

Раскідаецца задоўга да сяўбы, пад яравыя—увосені, пад азімыя — калі начынаюць вазіць гной у поле. На дзесяціну высеваецца 18—24—36 пуд. Памагае ў працягу 3—5 гадоў. Пры куплі трэба зварачываць увагу на размол. Зьмелена павінна быць так, каб ня менш як 80% праходзіло праз сіта № 100. Пасьля таго, як тамашляк высеяны на ральлю, абавязкова трэба яго загарадзь на 2—3 вершка ў глыбіну.

Калійнае ўгнаеньне.

Кайніт. Падобны на звычайную соль. Мае ў сабе 12% калія. Калі змолаты, то страшэнна гіграскапічны, прыймае ў сябе вільгаць і дзеля гэтага робіцца грудамі. Каб уберагчыся ад гэтага да кайніту дамешываюць каля 2% тарфянога парашку.

Ужываецца на лёгкіх пяшчаных грунтах, пад ячмень, пшаніцу, авёс, канюшыну і на сенажаць.

Пад ячмень падсейваецца вясною, пад пшаніцу, авёс і бабовыя расьліны, ўвосень. Высейваюць да сяўбы і трэба загараць на 3—4 вяршкі, памагае ў працягу 2—3 гадоў.

Зялёнае ўгнаеньне.

Ральля засеваецца расьлінамі, галоўным чынам матыльковымі, якія потым загорываюцца Гэтым павялічываецца ў груньце колькасьць азоту, арганічных матэрыяў, зьнішчажаюцца благія травы.

На зялёнае ўгнаеньне надаецца лубін, грэчка, канюшына, віка, сэрадэля і інш. Загараць трэба перад красаваньнем, а найлепш у пору найбольшага красаваньня.

Зялёным угнаеньнем значна навялічываецца ўраджайнасьць зямлі, нават до некаторага стопня можна замяніць звычайны гной.

Усячына.

МАЛЕНЬКІЯ ТЭЛЕФОНЫ.

У Амэрыцы выпушчаны ў продаж кішанковыя тэлефоны. На усіх вуліцах Нью-Ёрку збудованы спэцыяльныя пункты, да якіх жадаючыя гаварыць могуць далучаць свае тэлефоны. Злучэньне з патрэбным нумарам робіцца аўтаматычна, без дапамогі цэнтральнай станцыі. Такі тэлефон важыць каля $\frac{1}{4}$ фунта і свабодна зьмяшчаецца ў кішэні.

ДРАБЯЗЫ.

Фабрыкі Форда ў Амэрыцы што год выдаюць 3 мільёны даляраў на рэкляму.

Гадавая пэнсія маршала француcкай арміі роўняецца 90,000 фр., падпаручніка 9,936 франкаў.

У Калоаце маленькай дзяржаве Белуджыстану, толькі ў леташнім годзе адменена рабства (прыгон).

Падарожа англійскага наступніка трону да Аўстраліі капітавала 25,000 фунтаў стэрлінгаў. Наступнік трону памілаваў там вялікую колькасьць праступнікаў, і тakім чынам зьбярог дзяржаве 40,000 ф. ст. (кошт утрыманьня вязьняў).

Ходзяць чуткі.

Што Манька-Татунька выходзіць замуж за Цюфяк-Кабылкіна. Пасажонай маткай будзе Стася Вашэйла, а бацькам Гікала-Знамерскі.

Вясельле адбудзецца на паўдні Францыі ў Вэрсалі. Вясельле будзе без гарэлкі..

Што ў Наваградку скора будзе асобны квартал беларускіх адвакатаў, выбудаваны за грошы ўдзячных кліентаў.

Што пасол Гарбуля страціўшы ўсіх сваіх слухачоў, што—вечар кажа палітычныя прамовы да сваей глухой цёткі.

Што пасол Ерамеіч ў абароне сваіх ворагаў грамадаўцаў страціў ня толькі розум (якога меў не за шмат...), але і голас... Дык ужо ня можа казаць прамовы і шукае для сябе заступніка.

Што Сельсаюз пастанавіў складаць з эканоміі сябраў свае гурткі ня з трох асобаў, як дагэтуль,—а з аднэй.

Юрыдычныя парады.

Чытачу Міх. Чарвякову. Эстонія Адказ на пытаньне куды лепш эміграваць знойдзеце ў брашуры „Куды і як эміграваць“, якая адначасна з гэтым высылаецца Вам З абазначаных на аблож. цы брашуркі праў'лаў аб дакумэнтах, які'я патрэбны — паказаны ў п.п. 2, 3 і 5 — спэцыяльна для Польшчы. У вас у Эстоніі мо' іншыя патрэбы Даведайцеся аб гэтым на мясцы. Дарма з Польшчы нікому ехаць нельга Насколькі даведаліся мы — так сама нікуды тымчасам дарма не вязуць-і з Эстоніі.

С. Харытанюк — Вам такжа пасылаецца брашура „куды і як эміграваць“. Калі ня маеце і ня можаце дастаць абыватэльства, а з Канады можаце атрымаць патрэбныя дазволы — дык проста зьвярніцеся да ўладаў з заявай, што зусім выежджаеце з Польшчы. Аднак перад гэтым дастаньце ўсе патрэбныя на ўезд ў Канаду дакумэнты з Канады жа

Старадауная культура.



Больш 3000 гадоў таму назад існавала ўжо эгіпецкая культура. Сьведчаць аб гэтым шмат раскопак. Асабліва цікавыя рэчы знойдзены ў пірамідзе фараона Тутанкамона. Вышэй паданая фатаграфія прадстаўляе фігуру багіні Ізіс, якую знайшлі ў гэтай пірамідзе.

Паштовая скрынка.

Місюкевіч Мікола — адказ высылаецца поштай.

Саевіч Бр. — Вашая просьба сьмешная.

Захарка Кульгавы — газэту высылаем Вам дарма ўзамен за карэспандэнцыі. Нумары, якіх просіце — разыйшліся. Высылаем Вам адозвы Распаўсюджывайце. Калі ня хопіць — напішыце; тады прышлем яшчэ.

Ерш Залескі — на зьвягу ніколі ўвагі не зьвяртаем.

Янка Тарасаў — з прысланага карыстаем.

Ш. М. — калі будзеце і надалей прысылаць карэспандэнцыі — дык высылкі газэты ня спынім

Стоцікам — як ужо раней падавалася — палітычным вязьням „Беларускае Слова“ высылаецца бязплатна.

Гіль Язэп — пробны нумар высылаем, а даплатных пісьмаў больш прымаць ня будзем.

Маладзяновіч Янка, Курылюк С., Амелянчук Павал, Яроміч Мікола, Тарасэвіч Тодар, Масьцерка Янка, Завадзкі М, Алехна Антон, Карповіч Янка — „Беларускае Слова“ высылаем.

Лукашэвіч Піліп, Варанцоў Пётра, Салавей Янка, Вайтасэвіч Міхал, Войтко Аляксей, Шапель Міхал, Грынько Мікола, Ліневіч Сьцяпан, Фельдрын Мятоды, Скобелеў Тодар — пробныя нумары высылаем

Атрымана ад Пачобута А. Курыловіча Базыля, Фукса Людвіка — па 2 зл. 50 гр., ад Федарука і Сасноўскага па 2 зл., ад Высоцкага В. 1 зл.

М. Чарвякоўу Рэвэлі і С. Харытанюк са Слоніма — адказ на Вашыя запытаньні даецца ў гэтым нумары. Адначасова высылаюцца і кніжкі.

Сябрам Т-ва „Прасьвета“ Бабрукевічу Міхасю, Сідаровічу Антону, Юркевічу Аляксандру Жэгалю Язэпу, Гульніцкаму Петры. Гульніцкаму Міколаю, Лазоўскому Браніславу, Лазоўскому Язэпу Лазоўскому Адаму, Грынцэвічу Янцы — „Беларускае Слова“ высылаем.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. Пасьпешная, Вільня Біскупья 12. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.